*ул.* – дер. Коробчицы Гр. р-на Гр. обл., *Звонкая ул.* – дер. Занивочье Чашн. р-на Вт. обл., *Красивая ул.* – аг. Ждановичи Мн. р-на Мн. обл., *Любимая ул.* – дер. Чичели Пост. р-на Вт. обл., *Могучая ул.* – дер. Коробчицы Гр. р-на Гр. обл., *Родная ул.* – дер. Приселки Лог. р-на Мн. обл., *Сердечный пер.* – дер. Голынец 1 Мг. р-на Мг. обл., *Сказочная ул.* – дер. Басмановка Узд. р-на Мн. обл., *Строгая ул.* – аг. Ольшаны Стол. р-на Бр. обл., *Счастливая ул.* – аг. Старица Коп. р-на Мн. обл., *Хитрая ул.* – дер. Чеботари Лог. р-на Мн. обл., *Хлебосольная ул.* – дер. Рагели Пост. р-на Вт. обл., *Хорошая ул.* – дер. Приселки Лог. р-на Мн. обл., *Чудный пер.* – дер. Дроковка Чаусск. р-на Мг. обл., *Уютный пер.* – аг. Грудиновка Бых. р-на Мг. обл. При этом, названия данной группы появляются путем метафоризации отличительных свойств линейного объекта или каких-либо качеств его жителей.

Эмоционально маркированные названия транслируют особенности восприятия внутрисельского линейного объекта номинатором. Они могут носить не только констатирующий, но и пожелательный характер.

В виконимии каждой области функционируют *Звёздная ул., Радужная ул., Тенистая ул., Тихая ул., Солнечная ул.* (в значении *светлая*), *Светлая ул.* В пяти областях зафиксированы *Медовая ул.*, *Весёлая ул., Ясная ул.* Самыми частотными среди виконимов, экспонирующих эмоционально-характерологический код культуры, выступают названия *Солнечная ул.* – 694 населенных пункта – далее н.п., *Тихая ул. / Тихий пер.* – 196 н.п., *Светлая ул.* – 97 н.п., *Радужная ул.* – 76 н.п., *Весёлая ул.* – 62 н.п., *Звёздная ул.* – 57 н.п., *Тенистая ул.* – 44 н.п. Следует отметить, что названия распространены неравномерно. Так, некоторые из них частотны лишь в отдельных областях: *Спокойная ул.* (Бр. обл. – 26 н.п.), *Красивая ул.* (Бр. обл. – 2 н.п., Мн. обл. – 20 н.п.). Эмоциональные характеристики, лежащие в основе наименований, можно условно разделить на положительные и отрицательные. В виконимии Беларуси функционируют названия, связанные с положительными эмоциями, а наименования, мотивированные отрицательными, не зафиксированы. Этот факт отличает виконимию от урбанонимии. В рамках последней, к примеру, функционировали названия *Грязная ул.* [1, с. 107]. Эмоционально-характерологические виконимы несут в себе субъективную оценку номинатора, выбиравшего название, исходя из своих предпочтений, которые могут не совпадать с впечатлениями других.

**Заключение.** Эмоционально-характерологический код реализуют виконимы, мотивированные понятиями эмоционально-чувственной сферы. При этом данные внутрисельские названия, отражая восприятие окружающей действительности, связаны с наименованиями положительных эмоций, свидетельствующих о настроении, ощущениях, впечатлениях, эмоциях номинатора и жителей населенного пункта сельского типа.

Литература:

1. Мезенка, Г.М. Коды культуры і ўрбананімія славян: падабенства і варыяцыі рэпрэзентацыі / Г.М. Мезенка // Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка : даклады беларускай дэлегацыі, XV Міжнародны з'езд славістаў, Мінск, Беларусь, 20–27 жніўня 2013 г. / НАН Беларусі, Беларускі нацыянальны камітэт славістаў. – Мінск: Беларуская навука, 2013. – С. 99–108.

## АМПЛІФІКАЦЫЯ І ЯЕ СТЫЛІСТЫЧНАЯ РОЛЯ Ў ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫМ ТЭКСЦЕ Р. БАРАДУЛІНА

***Дулуб А.А.***
*студэнтка 3 курса ГДУ імя Ф. Скарыны, г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Станкевіч А.А., доктар філал. навук, прафесар*

Аналіз сучаснай публіцыстыкі сведчыць аб тым, што каштоўныя магчымасці паўтораў блізкіх паняццяў не застаюцца незаўважанымі. Да іх звяртаюцца ў выпадках, калі неабходна перадаць нарастанне напружанасці, драматычнасці, узмацніць экспрэсіўнасць, вобразнасць [1; 2].

На эмацыянальнасць і экспрэсію публіцыстычнага твора ўплывае і ўжыванне такой стылістычнай фігуры, як **ампліфікацыя** – выкарыстанне блізказначных або аднатыпных па будове моўных адзінак ці канструкцый (сінонімаў, параўнанняў, эпітэтаў, аднародных членаў сказа і г.д.) з мэтай узмацнення экспрэсіўнасці. Удалае, апраўданае маўленчай сітуацыяй яе ўжыванне прыносіць артыкулу, нарысу вялікую карысць. Задачай нашага даследавання з’яўляецца вызначэнне відаў і стылістычнай ролі ампліфікацыі ў публіцыстычным тэксце Р. Барадуліна.

Дадзеная фігура маўлення можа мець розную будову, уключаючы ў свой склад разнастайныя моўныя канструкцыі. Найперш, трэба вылучыць ампліфікацыю, у структуру якой уваходзяць сінонімы. Размешчаныя ў пэўнай паслядоўнасці, сінанімічныя лексічныя адзінкі ўтвараюць своеасаблівы сінанімічны рад, які дазваляе ўдакладніць і дэталізаваць сэнсавыя адценні аднаго паняцця:

*Наогул, да роднай мовы народны паэт ставіўся надзвычай чуйна, ашчадна, любоўна* [3, с. 92].

Найчасцей ампліфікацыю ствараюць кантэкстуальныя сінонімы:

*Але ўпартая працавітасць ягоная недзе была блізкай да гранітнай цвердасці. А душа была лірычнай, балючай, успрымальнай* [3, с. 64].

Даволі цікавай з'яўляецца ампліфікацыя, у якасці кампанентаў якой выступаюць антонімы – словы з супрацьлеглым значэннем. Напрыклад:

*Ён з вялікім, я сказаў бы, безабаронным даверам ідзе да чытача, ідзе такім, як ёсць, ідзе са сваімі сумненнямі і перакананасцю, з радасцямі і пакутамі* [3, с. 38]; *Ушаччына была для Петруся Усцінавіча як павелічальнае шкло, праз якое бачыцца ўся Радзіма, з яе клопатамі і поспехамі, з яе радасцю і смуткам ёміста, велічна, чыста* [3, с. 94].

Няцяжка заўважыць, што антанімічная ампліфікацыя адразу спыняе на сабе погляд, моцна ўплывае на эмоцыі і пачуцці.

Ампліфікацыйныя рады могуць утвараць розныя лексіка-граматычныя класы слоў. Так, назоўнікі выкарыстоўваюцца з мэтай фіксацыі ўвагі на прадмеце выказвання: *Паэт не выстаўляецца перад чытачом усёзнайным докай, прыручаным маралізатарам, павучальнікам, заканадаўцам поглядаў і мод* [3, с. 38]; *Гэта само пакаленне паэта, якое прайшло азбуку жаху, гневу, нянавісці і любові* [3, с. 115].

Прыметнікі ўказваюць на якасць прадмета, яго істотную ўласцівасць:

*Пакуль будуць чытачы, якія даражаць адкрытым словам паэзіі, вершы Івана Драча будуць гучаць, бо яны задушэўныя і мудрыя, вечныя і надзённыя, яны сапраўдныя*! [3, с. 71].

Дзеясловы перадаюць дынамізм дзеяння, падкрэсліваюць яго інтэнсіўнасць, адзначаюць высокую ступень значнасці дзеяння:

*Гучалі вершы, песні. Успаміналі, шкадавалі, сумавалі* [3, с. 122;. *Як першы раз, калі хадзіць навучыўся, вырваўся малы з матчыных рук, адбегся ад маці, так і да апошняга развітання ўсё адыходзіць, ад'язджае, адлятае з розных мясцін, ад турбот, ад парад, ад заўваг маці сын* [3, с. 136]. У апошнім прыкладзе спалучаюцца ампліфікацыйны дзеяслоўны рад з субстантыўным, што ўзмацняе ступень моўнай экспрэсіі.

Спецыфіка дадзенай фігуры маўлення заключаецца ў магчымасці ўтрымліваць ў якасці кампанентаў ампліфікацыйнага рада вобразна-выяўленчыя сродкі, найчасцей тропы – эпітэты, параўнанні, метафары. У дадзеным выпадку мы маем справу з фігурай, максімальна насычанай экспрэсіяй, вобразнасцю, выяўленчай выразнасцю: *А вайна ў вершах, у паэмах паэтаў ваеннага пакалення як агонь, як боль, як радыяцыя ў крыві* [3, с. 115].

Адзначаная разнавіднасць ампліфікацыі выдатна стымулюе думкі чытача, тлумачыць незразумелае, выклікае цікавасць да звычайных з'яў, надаючы ім адценне навізны.

Ампліфікацыя як фігура паўтору садзейнічае стварэнню напружанасці выкладу, хуткасці, імклівасці выражэння думкі, паглыбленню зместу, павелічэнню эмацыянальнай афарбоўкі і ўзмацненню выразнасці выказвання. Яна дазваляе перадаць дынамізм апавядання, спосаб ажыццяўлення дзеяння, інтэнсіўнасць яго працякання, хуткую змену падзей, узмацніць і перадаць розныя якасці, уласцівасці прадметаў, паказаць разнастайнасць прадметаў акаляючай рэчаіснасці, адлюстраваць багаты спектр эмацыянальна-псіхічнага стану чалавека.

Літаратура:

1. Цікоцкі, М.Я. Стылістыка тэксту: вучэб. дапам. для студэнтаў выш. навуч. установ філал. профілю / М. Я. Цікоцкі. – Мн.: Бел. навука, 2002. – 223 с.
2. Станкевіч, А.А. Рыторыка: вучэб. дапам. / А.А. Станкевіч. – Мн.: РІВШ, 2010. – 316 с.
3. Барадулін, Р. Парастак радка, галінка верша: артыкулы, эсэ. – Мн.: Маст. літ., 1987. – 351 с.

## ЖАНР БАЙКІ Ў ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА КОРБАНА

***Ермачэнка А.С.***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Саматой І.В., ст. выкладчык*

Нямногія паэтычныя жанры валодаюць такой устойлівасцю і жывучасцю, як байка. Узнікла яна ў глыбокай старажытнасці і да нашых дзён зберагла свае асноўныя жанравыя ўласцівасці – іншасказальнасць зместу, алегарычнасць вобразаў, павучальнасць. У беларускай літаратуры байка з'явілася параўнальна нядаўна, у апошняй чвэрці XIX стагоддзя. Сваімі вытокамі яна непасрэдна звязана з фальклорам. Народная сатыра жывіла яе сюжэтамі і вобразамі, рэалістычным зместам, уплывала на фарміраванне асноўных стылёвых і жанравых уласцівасцей байкі. Першыя вопыты ў гэтым жанры належаць Ф. Багушэвічу, А. Гурыновічу, А. Абуховічу, Я. Купалу, Я. Коласу.

Савецкая эпоха выклікала да жыцця байкі Кандрата Крапівы, з імем якога звязаны найбольш значныя дасягненні ў развіцці гэтага жанру ў беларускай літаратуры.